# “Куточак Божага свету”

Кананові́ч Ніка Вітальеўна,
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Каладзішчанская сярэдняя школа”,
5 “Б” клас

Афіцыйная назва ёсць, безумоўна, у кожнай краіны. Але бытуюць і “іншыя” імёны, якія асацыятыўна нараджаюцца ў свядомасці людзей. “Краіна ўзыходзячага сонца” – так гавораць пра Японію, таму што людзям здаецца, што там раней, чым у іншых мясцінах уздымаецца сонейка. Кітай – “Паднябесная”, магчыма, з-за блізкасці да неба, а Беларусь – “сінявокая”…

І, бясспрэчна, большасць скажа, што гэта па прычыне таго, што ў нас шмат рэк і азёр, якія з нябеснай вышыні выглядаюць нібы сінія ясныя вочкі. І гэта ўсё вельмі сімвалічна. Здаўна вада выступала ў вобразе нечага чыстага і нават святога. З вадой былі звязаны абрады ачышчэння як у часы язычніцтва, так і ў перыяд хрысціянства. Сёння нам добра вядомы рытуалы хрышчэння дзяцей або акунання ў ваду на Вадохрышча. Усё гэта, па меркаваннях нашых продкаў, спрыяла ачышчэнню душы і пазбаўленню ад злых духаў. А на маю думку, таму і цячэ па зямлі нашай шмат рэк, б’ецца ў берагі вялікае мноства азёр, бо так яна ачышчаецца, гоіць раны свае.

Раны ад бясконцага мноства ваенных канфліктаў, тэрытарыяльных падзелаў, знішчэння большай часткі насельніцтва падчас Вялікай Айчыннай вайны, трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. Раны, якія не зажываюць, не зарастаюць. Таму і ідуць у нас часта дажджы, сыпле снег, бягуць ручаі, збіраюцца ў рэкі ці папаўняюць азёры. Гэта слёзы зямлі маёй. Гэта сімвал чысціні. Пагадзіцеся: пасля дажджу свет здаецца абноўленым, нанова народжаным. Таму слёзы – гэта не слабасць, гэта цудадзейная сіла маёй зямлі. Гэта наша “жывая вада”, якая дапамагае нам жыць, будаваць, падымацца пасля любых нягод.

Сінявокая… Тая, што нясе свету добрую волю, што кожным днём сваёй гістарычнай памяці, які поўніцца Хатынскім звонам і светам Вечнага агню, вучыць жыць у міры, заклікае да любові і павагі.

Мая Беларусь, ці, як лічыў Якуб Колас, “куточак Божага свету”, дзе цячэ “Жывая вада”.